размаўляць. Для гэтага выкарыстоўваюцца гульня, лялечны тэатр, казкі. Праграма "Шлях да слова" садзейнічае развіццю мовы.

Зыходзячы з вышэйпададзенага, лічым, што дзіцячая бібліятэка можа паспяхова развіваць інтэлектуальныя і творчыя здольнасці дзяцей. Дзверы бібліятэкі павінны быць шырока расчынены для іх, даючы магчымасць кожнаму набыць духоўныя сілы, душэўны спакой і радасць ад зносін з прыгожым.

**І.Ф.Толкач,**
*суіскальнік кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

## ТВОРЫ КАМПАЗІТАРАЎ БЕЛАРУСІ ДЛЯ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

У 20—30-х гг. XX ст. у Беларусі зарадзілася новая галіна кампазітарскай творчасці — музыка для асобных народных інструментаў, ансамбляў і аркестраў. Падставай для яе ўзнікнення было паяўленне ў рэспубліцы музыкантаў-салістаў – выканаўцаў на народных інструментах і прафесійных выканаўчых калектываў. Першыя творы для іх былі напісаны не прафесійнымі кампазітарамі, а самімі выканаўцамі. Да такіх твораў можна аднесці апрацоўкі Д.Захара для беларускага аркестра народных інструментаў, сюіту Г.Самохіна для секстэта домраў, апрацоўкі І.Жыновіча для цымбалаў, творы Жыновіча—Вальтэра для цымбалаў з фартэпіяна.

У пачатку 30-х гг. з'явіліся творы прафесійных кампазітараў для цымбалаў ("Сюіта» Р.Пукста, «Мазурка» Н.Сакалоўскага, «Ой, ды ў нашым сяле» А.Туранкова, «Ой, у лузе, лузе» Я.Цікоцкага) і творы для беларускага аркестра народных інструментаў («Ронда» М.Аладава, «Менуэт» І.Любана, «Беларуская сюіта» А.Туранкова, сюіта «На кірмашы» С.Палонскага).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шырокая канцэртная дзейнасць секстэта домраў пад кіраўніцтвам Г.Самохіна таксама выклікала цікавасць беларускіх кампазітараў. І, як вынік, з'явіліся наступныя творы для гэтага калектыву: «Скерца» М.Аладава, дзве сюіты А.Туранкова, «Рэкруцкая» Я.Цікоцкага.

У 1928-м—1930-я гг. творы кампазітараў для баяна, домры, балалайкі, гітары, дудкі не былі адзначаны.

Актывізавалася дзейнасць беларускіх кампазітараў у 1946-м г. —1960-я гг. Шырокая творчая дзейнасць беларускага аркестра народных інструментаў, рост яго выканаўчага майстэрства, інтэнсіўныя пошукі інструментальнага складу прыцягнулі да сябе ўвагу беларускіх кампазітараў. Гэта быў адзіны нацыянальны аркестр, і, вядома, ён з вялікім энтузіязмам прымаў кожны новы арыгінальны твор. У галіне народна-аркестравай музыкі працавалі Д.Камінскі, М.Чуркін, Я.Цікоцкі, І.Жыновіч, М.Аладаў, П.Падкавыраў, Я.Глебаў.

У 50-я гг. у Беларусі з'яўляюцца першыя творы для баяна, што было абумоўлена неабходнасцю стварэння педагагічнага рэпертуару. Сярод твораў беларускіх кампазітараў для баяна — «Фантазія» Я. Глебава, апрацоўкі С.Палонскага, «Фантазія на тэмы беларускіх народных песень» Д.Лукаса, сюіта «На балі ў тэкстыльшчыкаў» Р.Суруса.

Працягваецца работа беларускіх кампазітараў у галіне музыкі для секстэта домраў. Да названага ансамбля звярнуліся Л.Абеліёвіч, Г.Вагнер, Д.Камінскі, Р.Пукст, М.Чуркін, Я.Цікоцкі. Упершыню ў гэты перыяд з'явіліся творы для саліруючай домры ў суправаджэнні фартэпіяна. Гэта «Лісток з альбома» С.Палонскага, «Калыханка» С.Аксакава, «Ронда» Л.Захлеўнага.

Сярод твораў беларускіх кампазітараў для балалайкі — п'есы Ю.Грыгор'ева «Над річкою бережком» і «Частушкі», а таксама першы ў Беларусі "Канцэрт для балалайкі з аркестрам рускіх народных інструментаў" М.Русіна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 50—60-я гг. кампазітары звярнуліся да дудкі. У гэты час стала вядомай «Сюіта на тэму беларускіх народных песень» для квінтэта дудак У.Алоўнікава, «Сюіта» для аркестра беларускіх дудак Д.Лукаса.

Падагульняючы выказаныя думкі пра дзейнасць беларускіх кампазітараў у галіне музыкі для народных інструментаў, ансамбляў і аркестраў у 1946-м г. —1960-я гг., трэба адзначыць, што на гэтым этапе сфера дзейнасці кампазітараў развівалася ў напрамку асваення новых жанраў. Акрамя п'ес для цымбалаў, з'явіліся творы для баяна, домры, балалайкі, дудкі.

1970—1990-я гг. адзначаюцца плённай працай ў галіне народна-інструментальнай музыкі.

У галіне народна-інструментальнай творчасці кампазітары надавалі асаблівую ўвагу музыцы для беларускага аркестра народных інструментаў. І ў сучасны перыяд, нягледзячы на ўзросшую цікавасць кампазітараў Беларусі да асобных народных інструментаў, вялікай папулярнасцю карыстаюцца творы для аркестра К.Цесакова, Р.Суруса, А.Мдывані, В.Іванова, Я.Глебава, Г.Ермачэнкава, В.Помазава, Д.Смольскага, В.Малых, А.Друкта.

У рэпертуар выканаўцаў на цымбалах увайшлі творы У.Кур'яна, Г.Ермачэнкава, В.Кузняцова, В.Іванова, канцэртная фантазія «Жураўлі на Палессе ляцяць» І.Лучанка, п'еса «Званы» У.Дамарацкага, «Гарэзлівыя прыпеўкі» А.Друкта.

«Імправізацыя», сюіта «Зімовыя карцінкі» У.Грушэўскага, «Канцэрт» А.Клеванца, сюіта «Івянецкія сувеніры», «Беларускі напеў» І.Кузняцова, «Экспромт», «Легенда», «Фантастычнае скерца» М.Літвіна, канцэрт-паэма «Памяці В.Помазава» А.Мдывані, «Канцэрт», «Полацкая сюіта» Э.Наско, «Батлейка», «Вясковыя найгрышы», сюіта «Арэшак» В.Помазава, фантазія «З рога ўсяго многа» А.Рашчынскага, цыклы п'ес Л.Шлег, «Тры фантастычныя танцы», «Саната» С.Янковіча — гэтыя творы складаюць нацыянальны рэпертуар баяністаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яскравымі п'есамі папоўніўся рэпертуар дамрыстаў. Сярод твораў кампазітараў Беларусі для домры «Гумарэска» В.Войціка, «Шэсце-гратэск», «Канцэрт», «Скерца» Г.Ермачэнкава, «Канцэрціна», «Фантастычны танец» В.Малых, два канцэрты, п'есы «Чаму ж мне не пець?», «Фіеста» А.Клеванца, «Сюіта ў стылі рэтра» Э.Тырманд, «Беларуская полька» Л.Шлег.

На жаль, як і раней, невялікая колькасць твораў кампазітарамі Беларусі напісана для балалайкі. Але амаль у кожнага прафесійнага балалаечніка ў рэпертуары ёсць п'есы У.Солтана, Я.Глебава, Г.Гарэлавай, Г.Ермачэнкава, Л.Шлег.

На сучасным этапе з'явіліся першыя арыгінальныя творы беларускіх кампазітараў для гітары. Гэта п'есы В.Жывалеўскага, яго цыкл «Беларускія фантазіі ў старадаўнім стылі», «Прэлюдыя памяці Э.Віла-Лобаса» В.Войціка, цыкл У.Захарава «Настальгія па Вялікім княстве», «Цыкл у некласічным стылі» А.Літвіноўскага, «Тры навелеты» Я.Паплаўскага, «Паўстанцкая быліна» Г.Шэмета.

Поспехі выканаўцаў на народных духавых інструментах далі стымул кампазітарам для напісання музыкі для дудкі.

Народна-інструментальная музыка прыцягвае ўвагу беларускіх кампазітараў, і няма амаль ніводнага з іх, хто б не пісаў музыку для асобных народных інструментаў, ансамбляў ці аркестраў.

**Э.А.Усоўская,**
*аспірантка кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## ПОСТМАДЭРНІЗМ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Сучасная беларуская культура з'яўляецца своеасаблівым люстэркам сацыякультурных падзей, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ